**Н.Я.Шалупенка,**
*аспірантка*

# НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ У СІСТЭМЕ КУЛЬТУРЫ

Адным з найбольш дзейсных спосабаў самавыяўлення кожнага народа з'яўляецца традыцыйная народная творчасць, якая вызначаецца ярка выяўленай нацыянальнай самабытнасцю. Як сведчыць вопыт сучаснай гісторыі, роля традыцыйнай культуры асабліва ўзрастае ў перыяды нацыянальна-культурнага адраджэння, аб'яднання народа на аснове нацыянальнай самасвядомасці, станаўлення дзяржаўнага суверэнітэту, вызначэння свайго месца ў міжнароднай супольнасці.

Сёння Беларусь якраз перажывае гэтыя працэсы. І хаця ва ўмовах інтэнсіўных эканамічных, гандлёвых і культурных кантактаў нацыянальная культура адчувае ўплыў масавых стандартаў, але беларускі народ захаваў неацэнны нацыянальны набытак — традыцыйнае народнае мастацтва.

У Беларусі народнае мастацтва развівалася здаўна ў выглядзе хатняй мастацкай творчасці і розных рамёстваў: ганчарства, разьба па дрэве, ручное ткацтва, вышыванне, пляценне з лазы і саломы. На працягу тысячагоддзяў выпрацоўваліся, перадаваліся ад пакалення да пакалення і ўзбагачаліся новымі рысамі навыкі апрацоўкі матэрыялу, арнамент, формы прадметаў. У вырабах народных майстроў увасобіліся неабдымная, вечна жывая душа народа, яго багаты, назапашаны стагоддзямі практычны вопыт і эстэтычны густ.

Народнаму мастацтву Беларусі на ўсіх этапах яго бытавання ўласціва традыцыйнасць. Развіццё традыцый у народным мастацтве — вынік калектыўнага вопыту і перадачы яго з пакалення ў пакаленне. Разам з тым традыцыя — не застылая з'ява. У залежнасці ад новых умоў і патрэб грамадства адны традыцыі адміраюць, становяцца здабыткамі гісторыі (некаторыя віды вышыўкі, роспіс куфраў, набойка), іншыя аднаўляюцца, развіваюць новыя напрамкі, мяняюць характар (драўляная скульптура, саломапляценне, ткацтва і інш.).

Практычна не бытуе ў нашы дні традыцыйнае ручное кавальства, разнастайныя дрэваапрацоўчыя рамёствы. Аднак творчасць нешматлікіх майстроў, якія ставяць перад сабой задачы адраджэння забытага рамяства, сведчыць, што традыцыйнае мастацтва цяпер можа набыць другое жыццё.

У той жа час сёння актыўна бытуюць і нават развіваюцца тыя віды народнай мастацкай творчасці, якія арганічна ўключаюцца ў сучасны інтэр'ер, выконваюць мастацкія ці сувенірныя функцыі. Несумненна, пануючае становішча ў сучаснай народнай культуры Беларусі займаюць ткацтва і вышыўка, саломапляценне.

Безумоўна, вывучэнне, захаванне і развіццё народнага мастацтва — важная задача, вырашэнне якой мае непасрэдныя адносіны да нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі. Трэба не проста захоўваць і развіваць народнае мастацтва, але і асэнсоўваць яго традыцыі і сучасны стан. Гэта мае не толькі навуковую цікавасць, але і павінна аказаць уздзеянне на сучасную творчую практыку, на працэс далейшага развіцця народнага мастацтва і мастацкіх промыслаў Беларусі.

Трэба адзначыць, што ў апошнія гады ў краіне праводзяцца разнастайныя выставы, кірмашы, фестывалі, святы народнай творчасці, якія сталі яркай дэманстрацыяй жыццяздольнасці лепшых традыцый народнага мастацтва. Значную ролю ў адраджэнні традыцыйных народных рамёстваў адыгрываюць школы, студыі, Дамы рамёстваў, дзе моладзь аваладвае сакрэтамі народнага майстэрства. Усё гэта сведчыць аб тым, што адраджэнне і захаванне традыцый старажытных рамёстваў — адзін з асноўных накірункаў у развіцці культуры ўсіх рэгіёнаў Беларусі. Разгледзім гэтыя працэсы на прыкладзе Чэрвеньскага раёна.

Здаўна на тэрыторыі Чэрвеньскага раёна было шмат майстроў і ўмельцаў, у працах якіх увасоблены паэтычная прыгажосць роднай прыроды, духоўнае багацце саміх творцаў, шматвяковыя мастацкія традыцыі. У нашы дні на Чэрвеньшчыне не зніклі, а беражліва захоўваюцца ў сваёй непаўторнай адметнасці здабыткі матэрыяльнай і духоўнай культуры таленавітых продкаў, што перадаваліся насуперак усім выпрабаванням гісторыі з пакалення ў пакаленне. Сёння ў раёне жывуць і развіваюцца наступныя віды традыцыйнага народнага мастацтва: разьба па дрэве, ткацтва і вышыўка, ганчарства, саломапляценне і інш.

Разьба па дрэве — даволі распаўсюджанае рамяство на Чэрвеньшчыне. Ім займаюцца людзі рознага ўзросту і прафесій. Усяго ў раёне працуе 16 майстроў-рэзчыкаў па дрэве. Вырабы народных майстроў у большасці сваёй прадстаўляюць прадметы быту: лыжкі, мэблю, вазы, пано, шкатулкі. Дасканала валодае сакрэтамі гэтага рамяства народны майстар Мікалай Іванавіч Няхай. З самага дзяцінства займаецца ён разьбой па дрэве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А майстэрства гэта ад бацькі, які быў выдатным мастаком. Сярод яго вырабаў багата ўсялякіх сялянскіх гаспадарчых прылад: гэта і паліца кухонная, і каталка для цеста, і дубовая кадушка, драўляны ложак, крэсла, выкананыя з густам, аздобленыя беларускім народным арнаментам. Мікалай Іванавіч лічыць, што разьба па дрэве — частка нашай спадчыны, нашай гісторыі. А таму як помнік бацькам і дзядам нашым ім выкананы работы "Сейбіты", "Гусляр", "Развітанне". Вырабы майстра дэманстраваліся не толькі на рэспубліканскіх выставах, але і ў Германіі, Галандыі. Яны выклікаюць заўсёды вялікую цікавасць. Аб гэтым сведчыць безліч грамат, дыпломаў і іншых узнагарод, што атрымаў Мікалай Іванавіч за ўдзел у выставах. Мікалай Іванавіч Няхай — член Саюза майстроў Рэспублікі Беларусь. Далучыцца да творчасці, авалодаць дзівосным майстэрствам разьбы па дрэве моладзь можа ў гуртках, якія працуюць у школе мастацтваў, Доме дзіцячай творчасці, сярэдніх школах раёна.

Асобнае месца сярод народных рамёстваў займае саломапляценне. Захапляюцца гэтым рамяством і паступова перадаюць свае сакрэты моладзі народныя майстры. Рэчы, створаныя іх рукамі: чароўныя кветкі, птушкі, жывёлы, капелюшы, куфэркі, лялькі — сапраўдны скарб беларускага народа. Іх можна ўбачыць на раённых, абласных і рэспубліканскіх выставах. Майстры не толькі валодаюць рознымі відамі пляцення, інкрустацыі, але і развіваюць новыя напрамкі ў сучасным саломапляценні: робяць вянкі, каралі, біжутэрыю, галаўныя ўборы. Каб пашырыць веды ў галіне саломапляцення, праводзяцца семінары-практыкумы з удзелам народных умельцаў, працуе школа работнікаў клубных устаноў па гэтым відзе народнага мастацтва.

Захаваўся на Чэрвеньшчыне і ганчарны промысел. Апошнім часам заўважаецца рост цікавасці да ганчарства ў моладзі, якая імкнецца надаць новае, сучаснае гучанне старажытным лаканічным формам бытавога посуду. Чэрвеньскія ўмельцы ствараюць цацкі, прадметы гаспадарчага прызначэння (гаршкі, салонкі), вырабы утылітарна-дэкаратыўнага характару (падсвечнікі, фігурны посуд). Яны з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі раённых, абласных і рэспубліканскіх выстаў. Лепшыя былі ўзнагароджаны дыпломамі раённых выстаў, фестываляў народнай творчасці, абласной выставы "Ігуменскія ўзоры", рэспубліканскай выставы "Дрэвы жыцця". На выставе-продажы "Кірмаш — дажынкі-98" вырабы чэрвеньскіх майстроў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карысталіся вялікім попытам. Сёння, калі ганчарны промысел амаль не існуе, такія майстры садзейнічаюць адраджэнню і развіццю гэтага віду народнай творчасці.

Значнае месца ў народным мастацтве Чэрвеньшчыны займаюць ткацтва і вышыўка. Большасць тканых вырабаў сведчыць, што ткачыхі прытрымліваюцца традыцыйнай арнаментыкі і каларыстыкі. Іх яркія, мажорныя, насычаныя святлом вырабы ажыўляюць сённяшнія стандартныя інтэр'еры, надаюць ім непаўторнасць. Адметным стылем, вытанчаным густам, высокім майстэрствам, невычэрпнай фантазіяй адзначаюцца абрусы, покрыўкі чэрвеньскіх майстрых. Да нашага часу захавалі яны, пераняўшы ад матуль і бабуль, традыцыі беларускай нацыянальнай вышыўкі і ткацтва. Творы ткацтва і вышыўкі ўпрыгожваюць жытло саміх майстроў, уносяць хараство ў сучасныя гарадскія кватэры. Вырабы майстрых з Чэрвеньскага раёна атрымалі прызнанне на шматлікіх святах народнай творчасці, выставах. Прыемна адзначыць, што ў апошні час гэтым відам народнай творчасці займаюцца не толькі асобныя жанчыны, але і цэлыя сем'і. Вопыт і навыкі свайго майстэрства народныя ўмельцы сёння перадаюць сваім дзецям і ўнукам.

Традыцыйнае народнае мастацтва — гэта не толькі неад'емная частка культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі, але і трывалы падмурак, на якім развіваецца сучасная нацыянальная культура і прафесійнае майстэрства. Таму захаванне і развіццё шматвяковых традыцый народнай культуры — адна з асноўных задач сучаснасці. У апошнія гады на Чэрвеньшчыне вядзецца пэўная арганізацыйная работа ў галіне рамесніцкага мастацтва. Пастаянна арганізуюцца выставы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія знаёмяць з творчасцю майстроў, час ад часу высвечваюць новыя імёны ўмельцаў. Раскрыць сакрэты свайго майстэрства, падзяліцца вопытам народныя ўмельцы могуць на семінарах-практыкумах, сустрэчах, якія праводзяцца ва ўстановах культуры раёна. Пры раённым Доме культуры і адпачынку створаны клуб "Народны ўмелец", у які ўвайшлі народныя таленты з усяго раёна. Добрай традыцыяй сталі арганізацыя і правядзенне свят народнай творчасці, фестываляў народна-сямейнай творчасці. Так, у рамках святкавання 55-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 75-годдзя з дня ўтварэння Чэрвеньскага раёна ў ліпені 1999 г. у Чэрвені прайшоў фестываль сямейнай народнай творчасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Ігуменскія ўзоры". Творчыя работы народных умельцаў з розных куткоў Чэрвеньшчыны прадстаўлялі практычна ўсе асноўныя віды і напрамкі сучаснага народнага мастацтва. Прыгожыя, цікавыя вырабы з дрэва і гліны, лазы і саломы, каляровыя дываны, ручнікі, у якіх адчуваецца беларускі каларыт, зачароўвалі дзівосным хараством. Свае вырабы дэманстравалі не толькі сталыя майстры, але і іх дзеці, унукі.

Такім чынам, вышэйсказанае сведчыць аб тым, што традыцыйная народная мастацкая творчасць у Беларусі не толькі жыве, але і развіваецца, мяняе свой характар у залежнасці ад сучасных умоў. У аснове яе — глыбокія шматвяковыя традыцыі беларускага народнага мастацтва, мастацкіх промыслаў і рамёстваў.

**А.Я.Корсакава,**
*аспірантка*

## ПАРАТЭАТРАЛЬНАЕ ДЗЕЙСТВА ЯК ФОРМА ПРАЯЎЛЕННЯ МАСТАЦКАГА ПРЫМІТЫВУ ЭПОХІ БАРОКА

У эпоху барока паратэатральная культура складала неад'емную частку жыцця мясцовага "шляхецкага" грамадства. Яна з'явілася, як пісаў М.М.Бахцін, у той час, калі "адбываліся, з аднаго боку, адзяржаўленне святочнага жыцця, і яно робіцца парадным, з другога — яго бытавізацыя, інакш кажучы, яно адыходзіць у прыватнасны, дамашні сямейны быт" (1, с. 8).

На тэрыторыі Беларусі магнаты нагляднна ўвасаблялі ў жыццё барочны прынцып "жыццё — тэатр". Тут тэатр і жыццё, жыццё і тэатр цесна перапляталіся і ўзаемадзейнічалі. Гэта эклектычнае спалучэнне і параджала да жыцця мастацкі прымітыў, які ярка праявіў сябе ў паратэатральных дзействах.

Прымітыўны светапогляд і "сармацкая" ідэалогія знайшлі адлюстраванне ва ўсіх галінах жыццядзейнасці.

Магнаты з асаблівай пампезнасцю, раскошай і ўрачыстасцю абстаўлялі свае ўезды ў гарады або ўладанні, імкнучыся такім чынам увасобіць у жыццё "сармацкі" міф аб тым, што найбольш знатныя шляхецкія роды ўзялі свой пачатак ад рымскіх патрыцыяў. Параўноўваючы сябе з рымскім імператарам, які вярнуўся з перамогай з поля бою, у гонар таго ці іншага магната



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ